П. М. Сапоцька *(г. Маладзечна)*

# ВІЛЕНСКІ ПЕРЫЯД ТВОРЧАСЦІ І. К. КАНДРАЦЬЕВА

На працягу XVIII–XIX стст. Вільня, сведчаць навукоўцы, з'яўлялася месцам росквіту талентаў яркіх прадстаўнікоў беларускай культуры. Адным з іх быў гісторык, пісьменнік, перакладчык, драматург Іван Казіміравіч (Кузьміч) Кандрацьеў (1849–1904), родам з Вілейшчыны.

Сацыяльна-палітычная сітуацыя ў тыя часы на беларускіх тэрыторыях, далучаных у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі, была складаная з нагоды паўстання 1863–1864 гг. Расійскі ўрад праводзіў тут жорсткую палітыку: быў устаноўлены рэжым выключных законаў, накіраваных на ўзмацненне рускага ўплыву.

Віленскі перыяд жыцця Кандрацьева быў вельмі насычаным. З другой паловы 1860-х гг. ён служыць у канцылярыі апекуна Віленскай навучальнай акругі, пазней іграе ў Віленскім тэатры.

У Вільні пачынаецца яго літаратурная дзейнасць. З канца 1868 г. па пачатак 1871 г. Кандрацьеў друкуецца ў старэйшай газеце Віленскай губерні «Виленском вестнике» – адным з самых папулярных выданняў, якое дасягнула вялікага па тым часе ліку падпісчыкаў у 3 тысячы, а яе рэдакцыя была культурным асяродкам Вільні. У газеце выходзілі ўказы, распараджэнні ўрада і мясцовых улад, публіцыстычныя артыкулы, палітычныя агляды, фельетоны. З'яўляліся матэрыялы па беларускай этнаграфіі (працы М.В. Доўнар-Запольскага, Я.Ф. Карскага і інш.), беларускай літаратуры і гісторыі. У «Виленском вестнике» публікаваліся творы Уладзіслава Сыракомлі, Тэадора Нарбута, Юзэфа Крашэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і іншых навукоўцаў і пісьменнікаў. У розны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

час рэдактарамі газеты былі Антоній Эдвард Адынец, літаратар Адам Кіркор.

На станаўленне Кандрацьева як творцы вялікі ўплыў аказалі прадстаўнікі так званай, у мэтах імперскай палітыкі, «литературной окраины».

Самая ранняя публікацыя Кандрацьева – верш «Вильно 22-го октября 1868 г.», напісаны з нагоды асвячэння адноўленага Прачысценскага сабора. У вершы паэт адлюстраваў часы, калі на змену «мрачной эпохи засилья католицизма пришло благодатное умиротворение и возрождение “русских начал”» [2, с.45].

У гэты ж час з’яўляюцца вершы «Пречистенская церковь», «С каждым годом в крае нашем». Апошні – гэта своеасаблівы паэтычны каментарый да праграмы аднаўлення праваслаўных цэркваў-мураўёвак Маскоўскага патрыярхату, якія прыйшлі ў заняпад ці былі разбураны, і будаўніцтва новых храмаў у Беларусі і Літве. А ў вершы «19 февраля» аўтар услаўляе дзень адмены прыгоннага права ў Расіі. У вершы «С натуры» перадае ўражанні, пачуцці, якія выклікае ў паэта Вільня.

З 1869 г. Іван Казіміравіч поўнасцю прысвячае сваё жыццё прыгожаму пісьменству.

Акрамя літаратурнай творчасці, ён спрабуе сябе на тэатральных падмостках: спачатку іграе ў вандроўных тэатральных трупах, а затым у Віленскім тэатры, які заснаваў знакаміты артыст Санкт-Пецярбургскага Александрынскага тэатра П. Васільеў.

Таксама ў 1870 г. у Вільні выйшаў асобным выданнем вадэвіль Кандрацьева «Волостной писарь, или Где хвост начало, там голова мочало», у 1871 г. – этнаграфічна-побытавы нарыс «Торг в местечках Северо-Западного края». Затым у «Виленском вестнике» была надрукавана п’еса ў трох карцінах «Сценка на виленской толкучке», дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апісваюцца побытавыя сцэны, героямі якіх з’яўляюцца гандляры, гараджанін, вайсковец.

Як заўважна з першых публікацый, у творчасці І.К. Кандрацьева прасочваецца настальгія па Расіі. У той жа п’есе «Сценка на виленской толкучке» ў канцы трэцяй карціны гандлёвы працэс змяняецца вясёлай гульнёй на маставой, якая суправаджаецца рускімі танцавальнымі песнямі. Як адзначае прафесар А.І. Смолік, «змест твораў ва многім можна патлумачыць вынікам русіфікацыі паэта падчас навучання ў школе кантаністаў і ў фельчарскай школе Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі» [3, с.5].

На жаль, займацца літаратурнай працай на беларускай мове на тыя часы не было магчымасці: беларускае слова фактычна было выключана з дзяржаўнага і грамадскага ўжытку. З прычыны цэнзуры ў 1863–1888 гг. у Расійскай імперыі не было апублікавана ніводнага літаратурнага твора на беларускай мове.

Аднак важна адзначыць, што ў віленскі перыяд І. Кандрацьеў займаецца «поэтическим воспроизведением на русском языке лучших белорусских народных песен» [2, с.46], якія з’яўляюцца ўнікальнымі этнаграфічнымі ўзорамі. У «Виленском вестнике» (16 кастрычніка 1869 г., № 116) былі надрукаваны тры песні ў арыгінале і ў перакладзе І. Кандрацьева.

Першыя творы Кандрацьева адрозніваліся прамалінейнасцю і недасканаласцю формы, таму, публікуючы яго вершы, газета з мэтай апраўдання да прозвішча аўтара прыпісвала: «крестьянинъ». А да верша «Пречистенская церковь» рэдакцыя змясціла даведку: «Стихотворение это написано прибывшим в Вильну крестьянином Вилейского уезда Ив. Кондратьевым, которого несколько опытов в этом роде помещено уже нами в прежних номерах “Вестника”» [2, с.48].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акрамя «Виленского вестника», І. Кандрацьеў друкуецца ў часопісе «Воскресный досуг», «Иллюстрированной газете».

У 1870 г. праводзіцца конкурс п’ес для народных тэатраў, у якім удзельнічаў і наш суайчыннік. У 1872 г. па выніках конкурсу яго гістарычная драма «На Поволжье» была прызнана лепшай, а аўтару ўручаны Вялікі залаты медаль.

Шматлікія літаратурныя творы, напісаныя І.К. Кандрацьевым дастаткова па-майстэрску, з гумарыстычнымі ўстаўкамі і паслядоўна вытрыманымі характарамі, падабаліся чытачу, знаходзілі шырокі попыт.

Такім чынам, мы можам адзначыць, што віленскі перыяд у жыцці І.К. Кандрацьева даў магчымасць усвядоміць свой творчы патэнцыял, адчуць грунт, на якім узяў пачатак яго зорны шлях у Маскве – новы этап жыцця пісьменніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Кондратьев, И.* Вильна / И. Кондратьев // Виленский вестник. – 1869. – 23 окт. – С. 14.

*2. Лавринец, П.* Русская литература Литвы (XIX – первая половина XX века) / П. Лавринец. – Вильнюс : Вильнюс. ун-т, 1999. – 97 с.

*3. Смолік, А.* Аўтар песні пра забайкальскага бадзягу / А. Смолік // Краязнаўчая газета. – 2013. – 11 лют. – С. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ